часу можа трансфармавацца ў федэрацыю. Магчыма пры ўтварэнні СНД разлічвалі на доўгатэрміновае існаванне аб'яднання, на ўзнікненне доўгатэрміновых адносін паміж дзяржавамі ў эканамічнай, палітычнай і іншых сферах.

Узаемадзеянне краін ажыццяўляецца праз каардынуючыя органы СНД. Усяго ў рамках Садружнасці створана 82 органы, у тым ліку 66 органаў галіновага супрацоўніцтва. У рамках СНД дзейнічаюць наступныя органы: Савет кіраўнікоў дзяржаў, Савет кіраўнікоў урадаў, Савет міністраў замежных спраў, Міжпарламенцкая Асамблея, Эканамічны Суд і інш.

Згодна з рашэннем Савета кіраўнікоў дзяржаў СНД «Аб удасканаленні і рэфармаванні структуры органаў Садружнасці Незалежных Дзяржаў» Выканаўчы Сакратарыят СНД, апарат Міждзяржаўнага эканамічнага Камітэта Эканамічнага саюза, працоўныя апараты міждзяржаўных і міжурадавых галіновых органаў былі рэарганізаваны ў адзіны пастаянна дзеючы выканаўчы, адміністрацыйны і каардынуючы орган – Выканаўчы камітэт Садружнасці. У цяперашні час у склад СНД уваходзіць 11 дзяржаў з 15 рэспублік былога СССР. Вылучаюць наступныя катэгорыі дзяржаў – удзельніц СНД: дзяржавы-заснавальнікі, дзяржавы-члены, асацыяваныя члены, дзяржавы-назіральнікі.

Пытанні перспектыўнага развіцця СНД актыўна абмяркоўваюцца на навуковых канферэнцыях. Так, 28–29 верасня 2011 г. у Мінску адбылася Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «20 гадоў Садружнасці Незалежных Дзяржаў». 4 кастрычніка 2011 г. ў штаб-кватэры Міжпарламенцкай Асамблеі дзяржаў – удзельніц СНД адбылася міжнародная навуковая канферэнцыя «Содружество Независимых Государств: достижения, проблемы, перспективы». На наш погляд, найбольш перспектыўным і эфектыўным з'яўляецца супрацоўніцтва ў фарміраванні і развіцці агульнай эканамічнай прасторы дзяржаў – удзельніц СНД.

## НОРМЫ АХОВЫ ПРЫРОДЫ Ў СТАТУЦЕ 1588 г.

***І. А. Доўнар***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

Пераемна ўспрыняўшы палажэнні папярэдняга Статута 1566 г., новы звод законаў ВКЛ іх значна дапоўніў. Гэты тычылася і пытанняў аховы прыродных багаццяў, якія былі сканцэнтраваны ў дзесятым раздзеле Статута 1588 г. Так, першы артыкул гэтага раздзела паслабляў пакаранне за паляванне на чужой зямлі – у ім ужо не гаворыцца пра смяротнае пакаранне, але прадугледжваецца для парушальнікаў падвойны штраф, а таксама турэмнае зняволенне. Другі артыкул пад назвай «Цана звером диким», якім рэгламентаваўся штраф за незаконнае забойства дзікіх жывёл, у асноўным паўтараў палажэнні адпаведнага артыкула Статута

1566 г. Напрыклад, за забойства зубра – 12 рублёў грошаў, мядзведзя – 3 грошы і г. д. Аднак дадаткова ў артыкуле ўсталёўваўся штраф за собаля ў памеры двух рублёў, а таксама за куніцу – поўкапы грошаў.

Наступны артыкул некалькі падрабязней вызначаў парадак карыстання ўласнікамі борцямі, азерамі і лугамі, якія былі размешчаны ў чужой пушчы. Так, ім забаранялася браць з сабою сабак, зброю, якія маглі ўчыніць шкоду лясному зверу. А гаспадар пушчы, у якой былі размешчаны чужыя борці, азёры ды лугі, абавязваўся не ствараць перашкоды для карыстання імі: «А тот в чыей пущы озера, сеножати и борти будуть, также тых чужых входов своей пущы отнятии не можеть» (арт. 3).

Чацвёрты артыкул амаль даслоўна паўтараў палажэнні аб пакаранні гаспадара пушчы за незаконную лоўлю рыбы ў чужым возеры і скошванне чужога сенакосу. У пятым артыкуле гаварылася аб тым, што патрэбна было рабіць, калі б «хто бы застал чиего чоловека в своей пущи и пограбил». Верагодна, у сувязі з негатыўнай судовай практыкай палажэнні гэтага артыкула працэсуальнымі момантамі значна адрозніваліся ад аналагічнага артыкула папярэдняга Статута. Удакладнялася, якім чынам належыць абыходзіцца з правапарушальнікам. Так, гэтую асобу з аднятым чужым дрэвам трэба было разам са сведкамі весці у свой дом і не пазней трох дзён абвясціць яго пана. Апошні павінен быў на наступны дзень выехаць да пакрыўджанага, кампенсаваць шкоду, забраць правапарушальніка. Рэгламантаваліся таксама і наступствы, калі б пан не пажадаў узяць на парукі свайго залежнага чалавека.

Артыкулы 6–10 у асноўным, за выключэннем некаторых палажэнняў, паўтаралі тэкст аналагічных артыкулаў Статута 1566 г. Гэта тычылася і рэгламентацыі пытанняў аховы хмелішчаў, бброў, птушак і інш. Галоўным чынам змены тычыліся памераў штрафных санкцый. Напрыклад, за крадзеж чорнага бабра штраф павышаўся з двух да чатырох копаў грошаў, а за «карого» – з адной капы да двух. Верагодней за ўсё, гэта было выклікана памяншэннем з цягам часу колькасці гэтых жывёл.

Артыкулы 11 і 12, якія прадугледжвалі пакаранне за псаванне птушыных прынад, некалькі ўдакладнялі і развівалі аналагічныя палажэнні папярэдняга Статута. Так, у арт. 11 гаварылася не толькі аб «парубанні птушыных прынад», але і аб іх псаванні, а таксама аб адганнні «птах принажоных», або лоўлі іх на чужых прынадах. Акрамя папярэдне вызначанага штрафу ў памеры шасці рублёў грошаў, патрэбна было дадаткова заплаціць за злоўленыя птахі. У артыкуле 12, акрамя пашкоджання «злодейским обычаем» прынад, удакладнялася, якім чынам гэта можа быць зроблена, напрыклад, дзёгцем ці часнаком падмазана. Адносна крадзяжу птушынага шатра, таксама ўдакладнялася, што гэта шацёр «тетеричый». Акрамя таго, дадавалася, што калі хто-небудзь украў «сеть куропатьнюю», усталёўваўся штраф у адзін рубель грошаў.

Як і раней, значная ўвага надавалася ахове пчаліных борцяў і вырашэнню спрэчак аб борцях. Адносна прыналежнасці борцяў рэгламентавалася папярэдняе правіла – чыё «знамя» старэй, таго і дрэва. Артыкул 13, які называўся «Устава дереву бортному», прадугледжваў раней усталяваныя штрафы за няўмыснае псаванне бортнага дрэва: дрэва без пчол – 2 капы грошаў, з пчоламі – капа, за прызначанае на борць дрэва – паўкапы грошаў. А калі б хто «зладзейскім чынам» высек або спаліў чужое бортнае дрэва, павінен быў заплаціць за борць з нявыбраным мёдам – 3 рублі грошаў, за бортнае дрэва без пчол – 2 капы, за дрэва без пчол – капу, «за крем без борти иле их сказил» – па паўкапы грошаў за кожны.

Артыкул 14 прадугледжваў за выдзіранне пчаліных сямей без мёда штраф у памеры 2 капы грошаў, а за выдзіранне пчаліных сямей разам з уллем – 3 рублі. У адрозненне ад арт. 14 Статута 1566 г. гаварылася, што калі б злачынцу злавілі з доказамі злачынства – «мають сказати, яко злодея, на горло». Гэта значыць, што за здзяйсненне такога злачынства прадугледжвалася нават смяротнае пакаранне. Значна ўдакладняліся палажэнні арт. 15, які рэгламентаваў адказнасць за парубку гая. Калі шляхціц пасек дрэвы ў шляхціца, павінен быў заплаціць 12 рублёў грошаў, калі селянін у шляхціча пасячэ дрэвы, то плаціў 6 рублёў грошаў, а калі селянін у селяніна – 3 рублі грошаў. Новымі былі палажэнні аб выплаце штрафаў за кожнае парубленае дрэва, прычым удакладнялася, якое гэта дрэва. Так, за сасну – паўкапы грошаў, за дуб – капа грошаў і г. д.

Таксама ўдакладняліся палажэнні арт. 16, у якім вызначалася адказнасць за крадзеж дрэў і фруктаў з фруктовага саду шляхціца. Штрафы засталіся амаль папярэднія (напрыклад, за абрыванне яблыкаў – 12 рублёў грошаў), аднак удакладняліся працэсуальныя моманты і дадаткова ўводзілася адказнасць за крадзеж з чужога поля гароднiны.

У адрозненне ад папярэдняга Статута, які ўсталёўваў смяротнае пакаранне за наўмысны пажар у пушчах ды лясах, аналагічны сямнаццаты артыкул Статута 1588 г. прадугледжваў толькі поўную кампенсацыю прычыненай шкоды. Калі ж чалавек ненаўмысна ўчыніў пажар у лесе, то вызваляўся ад адказнасці пры ўмове прынясення прысягі аб неасцярожнасці гэтага учынку. Калі ж адмаўляўся ад прысягі, павінен быў поўнасцю аплаціць учыненную шкоду.

Артыкул 18, апошні ў гэтым раздзеле, быў новым у Статуце 1588 г. Пад пагрозай выплаты значнага штрафу ён забараняў паляваць на чужых землях ад свята «сёмае суботы» да заканчэння ўборкі ўраджая і ўсталёўваў, што калі якая-небудзь асоба, палюючы ў забаронены час на чужых землях, прычыніла шкоду, павінна была не толькі пакрыць страты, але і заплаціць пакрыўджанаму штраф 3 капы грошаў.

Такім чынам, Статут 1588 г., які дзейнічаў некалькі стагоддзяў, значна дапоўніў і ўдакладніў палажэнні аб ахове прыроды.